Установа адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі"



# У мастацкім агародзе…

Літаратурна-мастацкі зборнік

Гродна, 2016г..

УДК 821.161.1 (476-1)
ББК 84 (4Беі)

Друкуецца па рашэнню метадычнага савета
УА "Гродзенскі дзяржаўны абласны
Палац творчасці дзяцей і моладзі"

Складальнік: Г.П. Кузнецкая,
загадчыца інфармацыйна-бібліятэчным цэнтрам
УА "Гродзенскі дзяржаўны абласны
Палац творчасці дзяцей і моладзі"

Рэцэнзент: Д. М. Радзівончык,
галоўны спецыяліст Гродзенскага абласнога
аддзялення"Саюз пісьменнікаў Беларусі"

**У мастацкім агародзе..:** літаратурна-мастацкі зборнік/склад. Г.П. Кузнецкая. – Гродна: УА "ГДАПТДМ", 2016. – 48 с.

Зборнік прысвечаны паэту-гумарысту і сатырыку К. Крапіве з нагоды 120-годдя з дня нараджэння.

Разлічаны на масавага чытача.

УДК 821.161.1 (476-1)
ББК 84 (4Беі)

© Установа адукацыі
«Гродзенскі дзржаўны абласны
Палац творчасці дзяцей і моладзі»,
Каложскі парк, 1
230023, г. Гродна,
e-mail: detpl@tut.by

# Ад складальніка

Літаратура ад пакалення да пакалення несла дар дабрыні, любові, разумення вялікага свету, пераняты ў народа і замацаваны ў мастацкім слове. Дзякуючы творам літаратуры мы пазнаем свой край, жыццё і сябе.

Беларуская літаратура багата на таленавітыя творчыя асобы і сярод іх Кандрат Крапіва вылучаецца велічна, непаўторна, ярка. Яго творчасць трывала і надзейна заняла сваё пачэснае і ганаровае месца ў залатым фондзе беларускай нацыянальнай літаратуры. Чытачы з ім пазнаёміліся праз досціп смеху, які цэлай ракой хлынуў з баек, сатырычных вершаў. Крапіва заўсёды пісаў аб самым значным, істотным і важным, што наспела ў жыцці і патрабавала грамацкай ацэнкі. Яго творы на жывой зразумелай і блізкай мове ўвабралі ў сябе невычэрпныя багацці народнай мудрасці і гэта натхняе юных паэтаў да напісання сваіх вершаў, прысвечаных паэту і баек аб жыццёвых заганах і людскіх недахопах.

У дадзеным зборніку прадстаўлены лепшыя работы ўдзельнікаў абласнога паэтычнага інтэрнэт-конкурсу “У мастацкім агародзе...”., прысвечанага 120-годдзю з дня нараджэння Кандрата Крапівы. Творы пададзены ў дзвух раздзелах: вершы і байкі. Прапанаваныя паэтычныя радкі багатыя на цікавыя мастацкія вобразы, шматгранныя шчырыя пачуцці.

Мастацкае афармленне зборніка выканана юнымі мастакамі аб’яднання па інтарэсах “Студыя выяўленчага мастацтва” установы адукацыі “Гродзенскі дзржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі”, кіраўнік – Любоў Раманаўна Раманава.



# ВЕРШЫ

Малюнак
Воўкавай Аніты, 9 гадоў

**Самушчык Ганна**, **10 гадоў**
ДУА "Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі", аб'яднанне па інтарэсах "Вдохновение" (кіраўнік: Самушчык Н. А., педагог дадатковай адукацы).

## ГЛЯДЗЕЎ НА СВЕТ З УСМЕШКАЮ ПАВОЛІ…

Свой верш я прысвячаю чалавеку,
Які быў з Музаю, не сумаваў ніколі
І байкі трапна ладзіў. З-пад павекаў
Глядзеў на свет з усмешкаю паволі.
Яго імя ў творчым агародзе
Займае месца на галоўнай градцы,
Бо тым праславіўся ў гісторыі, ў народзе,
Што ўмеў, як зброяй, словам карыстацца.
І кожны верш яго жыццёвы, смешны, блізкі
Пранікне ў думкі, выкліча размовы…
Я шлю паклон вам шчыры наш і нізкі,
Што не забылі беларускай мовы!
Як не бывае паркаў ладных без скульптуры
Як не ўявіць без буйных каласоў нівы
Так нельга ўявіць літаратуры
Без творчасці Кандрата Крапівы.

**Тарас Марыя, 10 гадоў**
ДУА "Жытамлянская сярэдняя школа" Гродзенскага раёна
(кіраўнік: Саханава А. Б., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## НАШ ДЗЕД КАНДРАТ

Я яшчэ маленькая дзяўчынка,
Але кнігі я чытаць люблю.
Казкі, байкі, вершы і загадкі
У бібліятэцы школьнай я бяру.
Пра дзеда Крапіву я ведаю з "Вясёлкі":
Прыгожы там малюнак і партрэт.
Хачу сказаць, што спадабаўся толькі
Мне гэты верш, малюнак і сур'ёзны дзед.
Настаўніца пра Крапіву Кандрата
расказала,
Нам байкі, казку, вершы прачытала,
Даведаліся досыць многа мы
Пра лёс- жыццё Кандрата Крапівы.
Наш дзед Кандрат- найлепшы на планеце,
Бо любяць усе: дарослыя і дзеці.
Няхай жыве ў памяці людской
Сатырай, смехам, гумару ракой.

**Федасюк Ганна, 10 гадоў**
ДУА "Валеўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа" Навагрудскага раёна (кіраўнік: Жукоўская А. А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры)

***

У прыгожай вёсачцы Нізок
Вясною нарадзіўся хлапчучок.
Любіў птушак і звяроў,
Але ў слове забаўку знайшоў.
Што ні стане ён пісаць,
Так і цягне прачытаць!
Ён падарыў нам акуляры,
Каб прайдзісветаў выкрываць:
То барана прадыпламуе,
То падхаліма крытыкуе,
А часам моцна пекане –
"маску" тут жа ён сарве!
Пражыў доўгае жыццё,
Мудрым лічаць яго ўсе.
Бо ў мастацкім агародзе
Ён нічога не міне!

**Ануфрыева Настасся, 10 гадоў**
ДУА "Ліпнішкаўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы" Іўеўскага раёна (кіраўнік: Звярко А. М., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

***

Крапіва – пісьменнік шчыры,
Піша праўду дужа міла.
Абарве ўсім ён грывы,
Асабліва, хто ліслівы.

Наш Кандрацій Крапіва
Піша праўду ўжо здаўна.
Смех і радасць выклікаюць
Байкі дзіўныя яго.

Ганарлівасць і пыхлівасць,
Сквапнасць, зайздрасць і задзірасць –
Творы высмеюць усё,
Што дрэнны парастак дало.

**Багдановіч Артур, 11 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа № 1 г. Ліды" (кіраўнік: Пятровіч Ю. І., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## КАНДРАТ КРАПИВА

Гумар быў заўжды ў пашане:
Кат, суддзя і лекар ён.
Ганарымся, што ў сатыры
Крапіва наш – чэмпіён.

Ён умеў і байкі баяць,
І смяяцца над сабой,
І знішчальным сваім смехам
Ворагаў разладзіць строй.

Хоть пісаў ён у тым стагоддзі,
Не можа праўда састарэць:
"Дыпламаваных тых баранаў"
Мы можам і цяпер сустрэць!

**Вітукевіч Ігнат, 11 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа № 1 г. Ліды" (кіраўнік: Пятровіч Ю.І.,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## КРАПИВА И КРАПИВА

Кожны, хто хадзіў у школу,
Ведае, што ёсць паэт,
З псеўданімам ён пякучым
Дый вядомы на ўвесь свет.
Гумар у кожным яго вершы,
Пісаў байкі ён для нас,
Але трэба ведаць толькі,
Што смяецца ён і з нас.
Кожным летам каля плоту
Ёсць пякучая трава.
І завуць таго паэта,
Як пякучку – Крапіва!

**Яшкіна Аліна, 11 гадоў**
ДУА "Парэчская СШ", Гродзенскага раёна (кіраўнік: Сідарук Л. М., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

**ВЕРШ ПРА ВАЛЮ**

Валя дома. Цішыня.
На рабоце ўся радня.
За падручнікі засесці?
Ды сябры гуляюць дзесьці.

А яна сядзіць адна?
Цэлы вечар дапазна
Не да ўрокаў было Валі:
Яны ў хованкі гулялі.

На ўрок званок звініць
(Трэба ж было верш вучыць)
Як на грэх, у нашай Валі
Першым прозвішча ў журнале.

Вось ля дошкі Валянціна.
Непрыглядная карціна:
Скажа слова і запнецца.
Клас з яе ажно смяецца.

Тут ёй і падказкі "шлюць",
Правaліцца не даюць…
Ды ці Валі дапаможаш –
Розум свой ёй хіба ўложыш?

Не патрэбна і маралі:
У Валі вы сябе пазналі?
Эх ты, Валя-Валянціна,
Дзень – для спраў, гульні – гадзіна!

**Даўгун Надзея, 12 гадоў**
ДУА "Абухаўская сярэдняя школа" Гродзенскага раёна
(кіраўнік: Данілевіч І. Б., настаўнік беларускай мовы і літаратуры)

**КАНДРАТУ КРАПІВЕ**

Бягуць гады, бягуць стагоддзі,
Змяняюць зімы лета,
Але нязменны ўвогул людзі
І іх найлепшыя прыкметы.

Калісьці ты, пясняр праўдзівы,
Людскія душы лекаваў,
Хлусню, гардыню і ўсе "дзівы"
Ты з болем у сэрцы выкрываў.

Цяпер пра што ты мог пісаць бы?
На жаль, няма ніякай змены.
Шмат што маглі мы расказаць бы!
Твой талент нам заўжды патрэбны.

І "парсюкоў" у нас даволі,
І цвердалобых "бараноў",
"Махальнікі" таксама з болем
Імчаць наперадзе лгуноў.

Бягуць гады, бягуць стагоддзі,
Змяняюць зімы лета,
Але нязменны ўвогул людзі
І іх найлепшыя прыкметы.



Малюнак
Шынкарэнка Дарыны, 8 гадоў

**Чугай Ксенія 12 гадоў**
ДУА "Гімназія №1 имя акадэміка Я.Ф. Карскага г. Гродна", літаратурны гурток «Сугучча»,
(кіраунік: Зянько А. М., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## У МАСТАЦКІМ АГАРОДЗЕ…

Гэты хлопец з вёскі родам,
Ён паліў усе агароды
Трапным словам і сарказмам,
Пакаштуйце, ешце з маслам.

Ешце лыжкамі, чарпайце,
Крапіву ўсе ўспамінайце,
Што расце «вось тут пад плотам»
І пячэ ўсіх абармотаў.

А ці чулі, што казалі:
Плеткароў-жа наказалі.
Ім звязалі языкі –
Вось вам вынік, ён такі!

–Дэградацыя ўсюды!
–Што ты кажаш?! Вось дык цуды!
«У самагонцы, скоках дзікіх,
У мацюках заместа кніг»
Так гадуецца, бач, ліха
Наш народ, народ – артыст.

Дзедка не дае нам веры
І на Бабу ўсё крычыць:
–Ёсць уладарныя яшчэ меры,
Падпіхні – і будзеш жыць!

Падпіхні, каб лепей стала,
Каб нішто нам не мяшала.
Каб быў мастацкі агарод,
І заязджаў сюды народ!

Каб «хваля рэх» ніколі не згасала,
Каб яна магутнай стала.
Каб чуўся атраховічаўскі смех –
Ідзі з ім па жыцці, зрабі прабег!

**Белагур Яўгенія,14 гадоў** .
ДУА"Гімназія №1 г.Навагрудка"
(кіраўнік: Мацієўская І. В.,настаўніца беларусскай мовы і літаратуры

***

Бацька з маці вельмі рады:
Нарадзілася дзіця.
У сакавіцкі дзень халодны
Бог дае сям'і сынка.

Матка сына спавівае,
Песні родныя спявае.
І ў Бога для Кандрата
Просіць долі і дабра.

Хай расце хлапчук здаровы,
Сілы набіраецца.
І ў полі і на лузе
Працы не цураецца.

Але хлопчыку навука
Вельмі падабалася.
І ў вячэрнюю часіну
З кніжкамі не спалася.

Стаў настаўнікам народным,
А яшчэ меў Божы дар
І пакінуў беларусам
Шмат ён баек, вершаў, драм.

**Калодка Дзяніс, 13 гадоў**
ДУА "Елкаўская сярэдняя школа" Зэльвенскага раёна (кіраўнік: Літвінчык С. І., настаўнік беларускай мовы).

**"У МАСТАЦКІМ АГАРОДЗЕ…"**

Даўным-даўно у вёсцы недзе,
У далёкім уздзенскім баку,
Дзе палявалі на мядзведзя,
Ну, а дакладней, у Нізку,
Ён нарадзіўся.
Рос ён здольным,
Вучыўся ў школе, працаваў.
І марыў аб народзе вольным,
І яму вершы ён складаў.
Ён сам назваўся Крапівою,
Бо выпякаць хацеў усё,
Што было дрэнным, і сабою,
Да негатыву што вяло.
І хоць у мастацкім агародзе,
Сябе ён марнай зваў травой.
Так словам пёк! І так даводзіў!
Што апякала крапівой!
Пра марнатраўцаў і хапугаў,
Пра падхалімаў-забіяк,
Пра гультаёў і пра няўклюдаў…
Ну і пра розных там сабак.
І байкапісцам стаў вядомым,
Бо баек – сотні ў яго.
Пісаў паўсюль: і ў лесе, й дома,
І быў прычасны да ўсяго,
Што было дрэнным, сармлівым,
Пякло сумленне і гняло.
А абыякавым, маўклівым
Не мог ён быць.
Не мог – і ўсё!
Таму Парсюк яго адвечны,
Баран з дыпломам і Асёл,
І ганарлівыя Авечкі,
(Што ёсць і сёння ў нашых сёлах)
Праз жарт прад намі паўсталі
І так хапалі крапівы!
А хто сябе ў іх пазнавалі,
Уцякалі далей ледзь жывыя.

Вось так ён проста, жыва, смела
Падман высмейваў і ману,
Крытыкаваў усіх за дзела,
Усім даваў сваю «цану»
Таму быў крытыкам выдатным,
І драматургам –о-го-го!
Такое слова ў Кандрата,
Што ўсе баяліся яго!
Чаго ёсць варта яго «Брама...»!
Спяваюць гучна жаваронкі!
Свінячым мамантам таксама
Праходзіць жарт праз усе
старонкі...
Але ў канцы заўжды ўладу
Бярэ дабро у драме кожнай .
А мы дабру заўсёды рады,
Жыццю вучыцца ў творах
можна...
За творы гэтыя Кандрату
Падзяка наша і паклон.
Ён смех падкідвае ў хату,
І разважаць нас вучыць ён...

Яму народнага прызванне
Дала дзяржава ў часе хуткім.
А гэта – права на прызнанне
Ён лепшы! Усіх абнесла чутка...
Прайшло стагоддзе, а ў народзе,
Крылатым словам усё гучыць,
Усё Крапіва яшчэ ў модзе,
І Яго байка будзе жыць!

**Лаўрушчык Ксенія, 14 гадоў**
ДУА "Любчанская сярэдняя школа" Навагрудскага раёна (кіраўнік: Вееўнік В. В., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## ЗОРКА КАНДРАТА КРАПІВЫ

На паэтычным небасхіле яркай зоркай
(сумнення ў гэтым у мяне няма)
Узышла калісь і зараз ярка свеціць.
Яго імя Кандрат, ён - Крапіва.

Ён стаў Калумбам беларускай байкі,
Сатыры моваю ўмела гаварыў…
І мудрасцю пранізаныя словы
Для многіх пакаленняў падарыў.

Жыццё хацеў наладзіць і паправіць,
Пяром сваім знішчальны вёў агонь.
Ён ад няпраўды свет хацеў пазбавіць
І вынішчыць яе пякучкай –крапівой.

Ішоў прамою і нялёгкаю дарогай,
Кідаў ён выклік, і прымаў ён бой,
А поглядам прыдзірлівым і строгім
Далёка ўперад клікаў за сабой.

Настаўнік ён і сын свайго народа.
Камедыю і драму пакарыў.
І толькі праўду шчыраю душою
І трапнай моваю народу гаварыў.

**Кузьміч Ганна,14 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа № 6 г. Гродна" (кіраўнік: Аляхновіч М. В., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## КАНДРАТУ КРАПІВЕ

Як у казцы з "Жили-были",
Ён пачаўся як паэт.
Гумар, досціп і сатыра –
Яго зброя і сакрэт.
Быў ён як сатырык строгі
І суровы быў да тых,
Хто не сябраваў з законам,
Словам біў пад самы дых.
Ліхадзеям, падхалімам,
П'яніцам і несунам
Не даваў ён ім праходу,
Сек пякучкай па руках.
Ён наводзіў там парадак,
Дзе хтось блытае ў нас
І ў дзяржаўнае, як ва ўласнае,
Запускаў руку падчас.
Смела йшоў у атаку з брудам,
Мёў паганцаў ён мятлой.
Жыць у дружбе каб з законам
І не знацца каб з бядой.



Малюнак
Паліпчык Дамінікі, 6 гадоў

**Муртазіна Вікторыя, 14 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа №3 г.Скідзель" Гродзенскага раёна (кіраўнік: Кошчыц І. А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## КАНДРАТ КРАПІВА

120 год – гэта многа ці мала
З дня нараджэння прайшло Крапівы?
Творчасць яго знакамітая стала
І ў памяці нашай будзе заўжды.

Кандрат Крапіва, ты нас гадаваў,
Добрыя байкі для нас  ты складаў.
Гэтыя ж байкі вядомыя ў свеце,
Любяць чытаць іх сучасныя дзеці.

Ты нам пісаў аб зямлі беларускай,
Падарожжах, прасторах і рэчачцы вузкай…
Пра ўсё, што нам люба і міла
Табою, зямляк, ганарыцца краіна.

І колькі б не беглі гады ці стагоддзі…
Байкі заўсёды гучаць у народзе.
Шчыра, не прагнучы добрае славы,
Байкі Кандрата заўжды ў пашане.

Паклон табе шлём, наш славуты пісьменнік ,
Са Скідзельскай нашай зямлі!
Мы табой ганарымся і славім
Творчасць тваю ва ўсе вякі!

**Мулярчык Кацярына, 15 гадоў**
ДУА "Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі", аб'яднанне па інтарэсах "Чароўнае слова" (кіраўнік: Абухоўская Т. І., педагог дадатковай адукацыі).

## У МАСТАЦКІМ АГАРОДЗЕ…

У мастацкім агародзе
Розная расце трава.
І ўжо болей за стагоддзе
Кветкай ззяе Крапіва.
А дакладней  - нарадзіўся
Ён 120 год назад.
Дзе радзіўся, там згадзіўся,
Праўды і сумлення брат.

Ах, Кандраце, ў кожнай хаце
Талент твой – жаданы госць.
Здолеў ты намаляваці
Ўсё жыццё такім, як ёсць.
Ўжо ніколі не загіне,
Калі ўспомніць творчасць усю,
Твая жаба ў каляіне,
Ганарысты твой парсюк.

Як жывы, намаляваны
(Сустракаем зноў і зноў)
Твой баран дыпламаваны.
Колькі ж гэтых бараноў!
Прыгадаем у дарозе
Праз памерны грук калёс
Тую бабу, што на возе.
Ох, ні з месца гэты воз!

А жыццё – зусім не цацкі,
Баязлівец – быць бядзе.
Дзе пануе Гарлахвацкі,
Там навука ў цень ідзе.
Пачытаеш – гвалт і лямант,
Падзівуеш ад душы:
Гэты твой свінячы мамант
Усіх нашчадкаў насмяшыў!

Крапіва кране пякуча,
Ды не мог ён не сказаць.
І самому так балюча
Гэта бачыць і пісаць.
Хіба ж сэрца не балела
За краіну, за людзей?
Хто ішоў за праўду смела,
Той – мастацтву
дабрадзей.

Час ідзе, і век змяніўся,
Я у новы час жыву.
Ды чытач не пазабыўся
Пра Кандрата Крапіву
У жыцці, як у мастацтве
Ёсць і марная трава.
Недахопы ёсць у
грамадстве,
Ох, патрэбен Крапіва!

Ах, Кандраце, мілы браце,
Хораша з табой ісці.
Ты нас вучыш разважаці
Хто такія мы ў жыцці.

Ты нас вучыш не баяцца
На пасадах бараноў.
З Гарлавацкімі змагацца,
Прўду рэзаць зноў і зноў.
Хай сабе ідуць стагоддзі,
Новай зменіцца трава.
А ў мастацкім агародзе
Промнем ззяе Крапіва!

**Бутрым Андрэй, 15 гадоў**
ДУА “Навучальна-педагагічны комплекс Бобравіцкі дзіцячы сад – сярэдняя школа” Іўеўскага раёна (кіраўнік: Станкевіч Н. І., настаўнік беларускай мовы і літаратуры)

## УРОК ЖЫЦЦЯ

Думкі пра жыцця няўзгоды
Кружаць танцы-карагоды.
І байкі, што пісаў Эзоп
І сёння ў дзясятцы топ.
Ой, а пякучка-крапіва
Патрэбна і не раз, не два…

Наведаў я адну кантору
З заявай пэўнага ўзору,
А мне ў адказ: “Не то! Не так!
Ці ты не граматны, ці як?”
Уздыхнуў з адчаем: “Прабачэнне,
Вы мелі б крышачку сумлення,
І лаяць Вам мяне не гожа:
Я Вам у бацькі гажуся, можа”.
А мне ў адказ: “Такіх вас шмат, а я адна!”
Бы стрэл з гармат,
Гучалі словы гнеўна, грозна.
Тут чалавек зайшоў сур’ёзны –
Заціхлі раптам усе грымоты.
“Ой, Вы да нас? Што за турботы
Вас прывялі ў кантору нашу?
У імгненне мы праблему Вашу…”
Наведнік: “Як пісаць заяву?”
“Напішам самі, знаем справу”.
“Нібыта песня салаўя”, –
Тут сам сабе зазначыў я.

Вось Вам і баба з установы,
І Іваноў, махальнік новы.
Вось бы пякучай ім травы,
Не баек, а сапраўднай крапівы!
А заадно і мне знарок,
Бо атрымаў жыцця ўрок.

**Кепель Мікіта, 16 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа № 3 імя В.М.Усава г. Гродна" (кіраўнік: Целеш А.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## СЛОВА МУЖНАСЦІ І ПРАЎДЫ

Ён у мастацкім агародзе
Драматург і публіцыст,
Слыў сатырыкам у народзе,
Перакладчык і лінгвіст.
Выкрываў усе заганы,
Хібы нашага быцця,
Духам праўды апантаны,
Верай у моц і свет жыцця.

Вастрыё пяра адчуўшы,
Падхалімы і чынушы,
Злодзеі і прайдзісветы
Удзень хаваліся ад свету
Свету слоў, што прамянілі,
Ззялі водбліскам дабра,
Верай  праўды надзялялі
Той, што людскасць берагла.

Столькі слоў, крылатых, трапных
Ён пусціў у Божы свет!
Гуманіст і майстар здатны
Дбаў аб людзях увесь свой век.
Доўгі век… Амаль стагоддзе…
Праўда… Кнігі… Страты боль…
Жыццялюб і творца. У згодзе
Жыў з сумленнем і з сабой.

Аб духоўным ладзе, міры
Марыў Крапіва штогод,
Хоць не раз зброяй сатыры
Цэліў ён у людскі род.
Дык жыві ж, Крапівы слова,
Дух гармоніі трымай!
Слова мужнасці і праўды
Хай ляціць ад краю ў край.



Малюнак
Федасевіч Ульяны, 7 гадоў

**Галонская Надзея , 14 гадоў**
ДУА «Гімназія № 1 г. Масты» (кіраўнік: Малышка І. Л., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## КАНДРАТУ КРАПІВЕ

Сапраўдны майстар у розных жанрах,
Вядомы ўсім нам Крапіва,
У камедыях і вершах, байках
Свой талент раскрываў спаўна.

Высмейваў у творах ён заганы:
Упартасць, зайздрасць, прагнасць, злосць...
Ён вобразы ствараў старанна
Людзей, і птушак, і звяроў.

Ды толькі сэнс шукаць нам трэба
Не на паверхні – у глыбіні,
Схаваны ён, як зерне ў глебе,
У творах Кандрата Крапівы.

**Чакавая Алена, 13 гадоў**
ДУА “Юрацішкаўскі яслі-сад – сярэдняя школа” Іўеўскага раёна (кіраўнік: Сілюк Н. У., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## СТАРЭНЬКІ ВЕРАБЕЙ

Адзін старэнькі верабей
Не шанаваў сваіх дзяцей.
Ён толькі з дзеткамі сварыўся
Ды выхваляўся, ганарыўся.
І вось аднойчы верабей
Зімою моцна захварэў.
Пра бацьку дзеці не забылі
Ды, як маглі, яго лячылі.
І стала сорамна яму,
Што не бярог сваю сям’ю,
Бо хто б яму і дапамог,
Калі ў хваробе занямог.

Чытач, не будзь як верабей,
Не крыўдзі дарагіх людзей.

**Тучкоўскі Яўген, 15 гадоў**
ДУА "Бердаўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа" Лідскага раёна (кіраўнік: Зубовіч В.Я., педагог-арганізатар).

***

Сяджу, вучу Кандрата Крапіву,
А хлопцы за акном у мяч гуляюць!
Шкада, што я пабегчы не магу!
Затым у вершы словы я…губляю.
Выходжу на падворак ціха я
І – быццам верш сабе чытаю:
– За плотам рэчка ціхая цячэ,
Над галавой аблокі праплываюць…
І нібы гэты верш я сам пісаў,
Пра тую рэчку, пра аблокі,
Здаецца, я Кандратам Крапівою стаў
І напісаў пра родныя вытокі.
І ва ўсю моц, што меў я ў грудзях,
Верш той чытаў – і не змыліўся…
Я не заўважыў, як сябры прыйшлі –
З іх кожны сваім вершам пахваліўся!
…Да ночы мы сядзелі ля ракі,
Гамонячы пра Крапіву-паэта.
Паверце, з ім усе мы – землякі!
Давайце ганарыцца будзем гэтым!

**Маркель Мікіта, 15 гадоў**
ДУА "Першамайская сярэдняя школа"
Лідскага раёна
(кіраўнік: Нахоцкая Галіна Іванаўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры)

**ПАЭТУ**

Гартаю зборнік баек Крапівы
І сам сабе я ціхенька смяюся:
Героі на старонках як жывыя.
Табой, мастак, я вельмі ганаруся!
Паэт пайшоў, а творы засталіся…
Удзячны мы табе, пясняр, за гэта,
Бо смех і радасць сонечнай вясёлкаю
Высвечваюць чуллівую душу паэта.
Чытаем байкі мы твае і сёння,
Напоўненыя выкрывальным смехам,
І п'есы, дзе сатыра б'е
Сваім вясёлым, звонкім рэхам.
Мараль тваіх твораў такая,
Што вучыць нас на свеце жыць,
Умець прызнаць свае памылкі,
А з недахопаў кпіць.
Стараўся ты жыццё палепшыць творамі.
Твае нашчадкі не забудуць гэта.

**Клімец Яўгеній, 15 гадоў**
ДУА “Сярэдняя школа № 13 г.Гродно”, гурток “Знаўца роднай мовы” (кіраўнік: Малышка А.В., настаўнік беларускаі мовы і літаратуры).

## З ДУМКАЙ АБ КАНДРАЦЕ КРАПІВЕ

Ён найвялікшай радасцю жыцця
Струменіў сувязь з мілай Беларуссю!..
Усёй душой крычаў усім:
Ніхто яе хварэць не змусіць!
Не рабаваць набыткі скрозь вякі,
Каб не мутнелі сінія азёры!..
Каб не таілі жах яе шляхі,
Людзям насустрач зіхацелі зоры!

У яго радку – усё маё (я пэўніўся не раз)
І да нябёс я з гордасцю ўздымаўся!..
Не лез я ў путы непатрэбных фраз,
Калі ў сяло дзядоў сваіх вяртаўся!
І млела сэрца: сцішыўшы свой ход
Ад песняў, надвячоркам што блукалі!..
І шанаваў заўжды я свой народ,
Што зроблены, здаецца мне, са сталі!

Цаню я многіх шчырых песняроў,
Што славілі знаёмыя мясціны!..
Хто - будучы гатовым біцца ў кроў
За нас - нашчадкам баек сваіх кпіны
Пакінуў, як разумны правадыр,
Злячыў грахі людскія адмыслова!..
І паляцела за высокі тын,
Як музыка, ад беларусаў мова!

Ён простым словам любы краявід
Аддаў на суд бязмежнаму сусвету!..
І ужо таму не можа быць забыт
Той мецэнат з харызмаю паэта!
Зусім не дзіўна: жычка-Крапіва
Не плакаць вымагае, а смяяцца!..
І пажылыя людзі, і дзятва
Ім яшчэ доўга будуць захапляцца!

**Казакевіч Дзіяна, 15 гадоў**
ДУА " Сярэдняя школа № 11 імя генерала арміі А.І. Антонава г. Гродна" (кіраўнік: Міклашэвіч Л. М., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## ПРЫСВЯЧЭННЕ КРАПІВЕ

У мастацкім агародзе
Слынны дзядзька Крапіва
Цешыць словам асяроддзе,
Яго творы – смаката!

Вывучыўся, быў настаўнік.
Потым войнаў чарада.
Рэдакціраваў ён "Вожык",
Байкі выйшлі з-пад пяра.

Ды й навука, мовазнаўства
Так цікавяць спадара,
Што ў АН той затрымаўся:
Акадэмік – у руля.

Слоўнікі для нас складае
Навукоўца Крапіва.
Піша п'есы, словам грае,
Б'е сатырай гультая.

Атрымоўвае ён званні,
Узнагародаў цэлы стос.
І праблем няма з прызнаннем:
Да вышынь Кандрат дарос.

Добра, што ў народзе
Усім любімы Крапіва.
З мудрасцю яго ў згодзе
І дарослы, і дзятва.



Малюнак
Асоцкай Паліны, 7 гадоў

**Будрэвіч Марта, 16 гадоў**
ДУА «ГІМНАЗІЯ № 3 г. ГРОДНА»
(кіраўнік: Соснарс А. М., настаўнік беларускай мовы і літаратуры)

## ПЯКУЧАЕ СЛОВА ЖЫВОЕ

О, Беларусь, твае прасторы
Люблю я шчыра, усёй душой.
Здаюцца мне садамі зоры,
Калі ўзыходзяць грамадой.

Тут суайчыннікаў імёны,
Як кветкі, у садзе зіхацяць.
З дзяцінства нам яны знаёмы,
Радкі іх, як булат, звіняць.

120 год як нарадзіўся
Кандрат Кандрацiч Крапіва,
І талент ружаю раскрыўся,
І памяць пра яго жыва.

А творчасць уся, нібы пякучка,
Што не пад плотам узышла,
Раней і зараз абармотам
Усё цела шчыра апякла.

Жывуць радкі ў сэрцы нашым,
Пякуць, бічуюць і кляймяць,
Каб у жыцці маім і вашым,
Усе недахопы вытраўляць.

А байкі ўсе яго, як оды,
Дзе праслаўляецца дабро.
Змяняюцца часы і моды,
А ў іх ён першы ўсё адно.

**Дрэма Лізавета, 17 гадоў**
ДУА "Астравецкі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі", аб'яднанне па інтарэсах "Патрыёт.by" (кіраўнік: Кумішча Вераніка Мар'янаўна, педагог дадатковай адукацыі).

## ВОСТРАСЛОВЫ ДЗЕД КАНДРАТ

Жыў ды быў Кандрат-пякучка,
А дакладней - Крапіва.
Вершаў, баек стварыў безліч –
Вастрэй слоў яго няма!
Узняў на смех ён пустазвонаў,
Авантуру і шантаж,
Баязліўцаў пасаромеў,
Пляткароў й падхалімаж.

Стрэльнуў словам па ляноце,
Бескультур'ю даў адпор
І ўвагу засяродзіў
На двурушніцтве асоб.
Выкрыў ураз прыстасаванцаў,
Забабоны абсмяяў,
"Пашарсціў" і ашуканцаў,
Нерашучым параду даў.

Адным словам, майстар жанру
Падчапіў на моўны крук
Усіх, хто варты высміхання, –
І тым зацікавіў друк.
Вось такі Кандрат-пякучка,
Наш сатырык Крапіва!
У мастацкім агародзе
Вастрэй слоў яго няма!

**Халупка Аліна, 16 гадоў**
ДУА "Суботніцкая сярэдняя школа" Іўеўскага раёна
(кіраўнік: Арыка І. І., настаўнік геаграфіі).

## МАРАЛЬ КАНДРАТА КРАПІВЫ

Як гавораць у народзе,
Трэба жыць у міры, згодзе.
Толькі б плакаць не прыйшлося,
Ды без драмы абышлося.

Бо ў мастацкім агародзе,
Каля плоту, на прыродзе,
Ёсць не простая трава,
А пякучка - крапіва.

Крапіва пячэ як трэба,
Хто пад ногі не глядзіць.
Але ж тлустая там глеба
І спрыяльная радзіць.

Фельетоны і памфлеты,
Драмы, вершы – усё гэта
Барацьба дабра са злом.
Згадаць не цяжка Барана з Аслом.

Тых прагных бюракратаў, хітрых падхалімаў,
І прахадзімцаў, абібок і махляроў,
Прыстасаванцаў шэрых і пыхлівых –
Тых крывасмокаў, што пілі ў народа кроў.

Баран яшчэ пасецца на прыродзе,
Запэцканы Парсюк жыве ў народзе,
І Жаба, што кульнуць хацела воз,
І нехта Гарлахвацкага да нас занёс.

Напісана ўсё востра, сатырычна, гожа,
Сэнсоўна, заліхвацка і прыгожа.
Мараль яго і сёння актуальна,
А значыць - мысліў Крапіва глабальна!

**Галафаста Ільі, 17 гадоў**
ДУА“СШ№34 г.Гродна”
(кіраўнік: Фядзюк Юлія Анатольеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры)

**КАНДРАТУ КРАПІВЕ...**

Беларуская зямля
Талентамі грэта.
Усім вядомы Крапіва
З Мінскага павета.

Нарадзіўся ў Нізку.
Працаваў настаўнікам.
Ехаў лёсам у вазку,
Жартаваць стаў спраўненька.

Нейк газету атрымаў
Ён на мове роднай.
Сам пісаць туды пачаў
Чула і свабодна.

З фельетонаў, як умеў,
Пачынаў і з вершаў.
"Сорак баек", "Смех і гнеў" -
Адны з самых лепшых.

У вайну быў змагаром
Слова пераможнага.
Са сваім стаяў пяром
Ля вытокаў "Вожыка".

Дзед і Баба, конь, Цыган -
Вобразы, як кулі.
Дабівалі злосць, падман,
У часе не танулі.

Вершы, байкі незнарок
Выйшлі неблагія.
Здзейсніў ён чарговы крок -
У драматургію.

Бюракраты, кумаўя
З тых часоў баяцца:
"Ці апошнім буду я
З гэтага смяяцца?"

У мастацкім агародзе
Крапіва пякучкай стаў.
Але ў простым ён народзе -
Генерал жартоўных спраў.

Праміне вякоў нямала
На планеце спакваля.
Не забудзе "Генерала"
Беларуская зямля.



# БАЙКІ

Малюнак
Суцягінай Розы, 7 гадоў

**Пракопчык Тімафей, 7 гадоў**
ДУА "Шчучынскі палац творчасці дзяцей і моладзі" аб'яднанне па інтарэсам "Літаратурнае і мастацкая творчасць" (кіраўнік: Беляўская Г. П.).

## ЗАДАВАКА РЫЖИЙ КОТ

Жили в доме три Кота,
Были в доме ворота.
Коты часто там сидели
И на улицу глядели.
Вдруг однажды мимо дома
Пес прошелся незнакомый.
Испугался Черный Кот
И свалился он с ворот.
А за ним и Белый,
Кот такой несмелый.
Только Рыжий не боялся
И один сидеть остался.
Начал Рыжий выхваляться:
«Я могу за псом погнаться!..»
Пес нежданно оглянулся…
Рыжий тоже встрепенулся…
И свалился Рыжий тоже!
Задавака он, похоже….

**Казакевіч Арына, 9 гадоў**
ДУА "Смаргонскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі" (кіраўнік: Гуйская В.Л., загадчыца аддзела мастацкай творчасці і вольнага часу).

## ХТО ЛЕПШЫ?

Раз на школьным на двары
Пасварыліся сябры:
Хто з іх лепшы ў навуцы
І хто майстар на ўсе рукі.

Вось Алесь распавядае,
Што спартсмен сапраўдны ён.
А Кастусь не саступае,
Бо ён доказ спраўны мае –
Адзнак добрых аж мільён.
Гаварылі, разважалі,
А да мэты не прыйшлі.
Вырашалі, выдумлялі,
А пасля адказ знайшлі:
Кожны лепшы з іх па-свойму,
Кожны "дока", проста, клад…

Вы саромейцеся, браткі,
Адзін аднаго хваліць.
А прызнанне ў тым, што лепшы,
Яшчэ трэба заслужыць.

**Плотнікаў Кірыл, 9 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа №7 г. Навагрудка" (кіраўнік: Крышталь Л. У., настаўнік пачатковых класаў).

**САБАКА І МЯСНАЯ КРАМА**

У дажджлівы дзень, нібыта цень,
Блукаючы ля крамы міма,
Галодны пес падціснуў хвост
І разглядаў вітрыны.
Мурзаты, мокры ўвесь наскрозь,
С самотнымі вачыма
Ен паглядаў навокал скоса,
Але праходзіў міма.
Чаго тут толькі не было:
Цукеркі, булкі, малако, каўбасы…
У сабакі думкі только пра адно:
"Ах, колькі з іх было б магчыма прыхаваць запасаў!"..
І раптам наш бадзяка прыпыніўся,
Нюхнуў паветра, пачасаў за вухам лапай,
Зірнуў праз шыбу і здзівіўся:
"Як на такое хараство я трапіў?"
Тут паляндвіца і свіныя ляжкі, і філе індыка –
Усе прыгожа так ляжыць і маніць, маніць…
У галоднага сабакі страўнік аж зарыкаў,
І стаў ен думаць як у сярэдзіну патрапіць.
І вырашыў за чалавекам услед прайсці,
Але то нос, то лапу прыцісне дзвярыма,
На раз чацверты атрымалася ўпаўзці,
Дык венікам нагнала гаспадыня.
Прысеў блуклівы на зямлю,
Яшчэ раз пачасаў за вухам.
Уздыхнуў: "Чаго як дурань тут сяджу?
Магчыма мяса ўсе пратухла!"
Пакрочыў далей наш герой,
Бо ўспомніў як учора ен прыкмеціў,
Калі гнаўся за зграямі варон,
Рэшткі памыяў у кучы смецця.

------

Вось так і людзі, як той пёс:
Аб нечым вельмі доўга мараць,
Але адразу ж апускаюць нос,
Калі да мэты цяжка трапіць.

**Гаўрылюк Варвара, 9 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа № 7 г. Навагрудка"
(кіраўнік: Зянкевіч Н. А., настаўнік пачатковых класаў)

## СЛАБЫ І ДУЖЫ

Слабы і дужы палезлі ў лужу,
Два браты: слабы і дужы
Цягнуць воду, носяць з лужы.
- Я дужэйшы, я магу
Ўлезці з лыжкай на дугу.
На дугу калёсную,
Што вісіць за вёскаю.
Па-над полем, па-над лугам
Па-над рэчкай, па-над бугам.
З той вады, яшчэ з мукі
Я спяку там пірагі –
Не ржаныя, не мучныя –
Хмара-вода-даждавыя!
Пакідаю з вышыні –
Ну а ты давай, лаві!
Як наловіш пірагоў
Дык нясі хутчэй дамоў.
Потым буджем разам есці:
Дзень, і два, і тры, і дзвесці…
Брат адказывае: – не!
Лепш пайграю на трубе.
А дажджовыя баханкі
Еш адзін ты спазаранку!
На прыдумках і хлусні
Сыты ты не будзеш ў дні.
Хоць шырокі маеш плечы –
Розумам ты не далечы!
Я плячыма хоць й слабы,
Розум маю я даўгі.
На трубе я паіграю –
Глядзіш, на хлеб і назбіраю!



Малюнак
Дарашкевіч Валі, 11 гадоў

**Лях Лізавета, 10 годоў**
ДУА " Гімназія №1 г. Дзятлава" (кіраўнік: Абрамчык А. Р., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## ЗАДЗІРА

Так бывае ў гэтым свеце,
Што цярпення не стае.
І тады мы распускаем
Кулакі ўжо свае.
-------
Так было і ў адным класе-
Не скажу калі і дзе-
Там вучыўся хлопчык Вася,
І не думаў аб бядзе.
Часта Вася задзіраўся,
Нецярплівы надта быў:
Ён пабіў залетась Севу,
Сашу з лесвіцы спусціў.
А Ягору- ну і гора-
Шрам пакінуў на шчацэ.
Біўся хлопец-вось задзіра!-
Усім, што мелася ў руцэ.

Ды бывае і спагнанне,
Бо жыцця закон такі,
І расплата за ўсё хамства,
За ўсе чыста сінякі.
Летам ён пабіўся з Пецем,
Збіў хлапчыну на нішто.
І бацькі Пятра рашылі
Не прабачыць нізашто.
-------
Зараз Пецяна ўліку,
Строгі за хлапцом кантроль.
І наказ яму такі:
Прытрымай ты кулакі!

**Чурылава Ульяна, 13 гадоў**
ДУА “Сярэдняя школа №5 г. Смаргоні”
(кіраўнік Цітова М. С., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## СПРЭЧКА

Падышоў Мікітка да стала,
Прывычна - зірк на манітор….
Ды надакучыла гульня…
- Схадзіць праветрыцца ў двор?…

А ў гэты час паміж сабой
Заўзята спрэчку завялі ж
Сістэмнік, манітор,
Камп’ютарная мыш.
-Вы хто такія без мяне?
Я ж ўсяму тут галава.
Залежыць толькі ад мяне,
Куды направіцца курсор,
Замрэ “вінда” ці ажыве.
А захачу – націсну “пуск”
Ды ўсю работу завяршыць -
І перастанеш ты свяціць
Ды вочы ўсім сляпіць! -
пішчала ўтрапёна Мыш…

Тут Манітор як блісне вокам:
-Ах ты, стварэнне аднабока!
Як я экран свой пагашу
(Дазволу ў цябе не папрашу),
Адразу згінеш ты дазвання,
І ні курсора, ні цябе не стане!
Во тут Сістэмнік і загуў:
-Каб я так жыў, падумаць толькі,
Вы ж без мяне – адны чаропкі…

А тут Мікітка кнопку ціскануў –
Замоўклі ўсе: хто гуў і хто не гуў…

Мараль? Яна навідавоку:
Калі загуў ад пыхі,
Успомні кнопку.

**Капачэўская Ганна**, **12 гадоў**
ДУА “Юрацішкаўскі яслі-сад – сярэдняя школа” Іўеўскага раёна (кіраўнік: Свякла А. К., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## ЯК КОТ З МЫШАМІ СЫР ДЗЯЛІЎ

Аднойчы ясным цёплым ранкам
Сядзеў разумны кот пад ганкам.
Задумаў ён лавіць мышэй.
А як прывабіць іх лягчэй,
Ці мала думаў кот ці многа,
Ды не надумаў лепш нічога:
Трэба знайсці кавалак сыру,
Пайду да іх нібыта з мірам.
Падсуну сыр ім у нару
І тут здабычу забяру.

Пачаў кот гэтак і рабіць,
А мышы сталі гаварыць:
-Ты, кот, разумны, клапатлівы,
І мудры, і добразычлівы.
Прыйшоў ты сырам падзяліцца,
Ну, як табой не ганарыцца?”

А кот і сам заганарыўся,
Пра сыр і пра мышэй забыўся,
Пакуль сабою любаваўся…
Ды так ні з чым ён і застаўся.
А мышы сырам частаваліс,
З ката разумнага смяяліс.

Таму такі, чытач, зварот:
Не будзь як той разумны кот,
Яго за прыклад не бяры
Ды не ўздымай нос дагары.



Малюнак

Зімірывай Ульяны, 7 гадоў

**Каржонка Дар’я, 14 гадоў**
ДУА “Вераб’евіцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа” Навагрудскага раёна (кіраўнік: Мароз Д. Б., настаўнік гісторыі).

**ВОРАН І ШПАК**

На ўскрайку лесу,
Між бяроз, альшын,
Прычакаўшы весну,
Воран сеў адзін
І завёўся песняй
Хрыплаю, глухой –
Мёртвы ўваскрэсне
Ў труне сваёй!
Ў думках варанячых
Мара дурня ёсць,
Што не горш закарча,
Чым прылётны госць,
Што з паўднёвых земляў
Родны кут знайшоў,
Ля шпакоўні трэлі
Розныя завёў.
Воран ж голас грубы
З шпачым параўнаў,
Горда ўскінуў дзюбу
І закаркатаў.
Не зважае чорны
На музычны слых.
Ён жа непаўторны,
Рвецца за дваіх,
Заглушыўшы енкам
Пераліў шпака.
“Гэта вось распеўка,-
Думае з сука.-
Не табе, драбнота,
Цягацца са мной.
А калі ахвота,
То давай, скуголь!”
Шпак на крык вар’яцкі
Ўвагі не звяртаў,
І матыў знянацку
Новы загучаў.
А праз колькі часу –
Змен мелодый зноў.
Так вось кожным разам,
Кожнаю вясной…
Кожнаю вясной…
Воран жа гучанняў
Мудрых не шукаў.
Як заўжды звычайна
Гучна каркатаў.
Думаў, немым крыкам
Сцягне слухачоў,
Ды вушам нязвыклы
Песні крумкачоў.
Да спадобы людзям
Не вароны “кар!”
Не вышэйшай пробы
Гэты лямантар.
Не пачуў падзякі
Варанячы енк.
Не, яму са шпакам
Не цягацца лепш.
Сціхнуў раптам воран
І над лесам ўзмыў.
Над зямлёй павольна
Шпачы спеў паплыў.
Воран злосны, чорны
Ў гушчэчы сеў.
Шпак свой непаўторны
Не скончае спеў.
***
Не вароне – песні,
Не нахабству – шлях.
Ведай сваё месца,
Дзе ты ў руля.
Не аб’ешся славы,
Як ты не гарлай.
У чужыя справы
Носа не сувай.
Не разломіш шаблю
Тоненькім кійком.
Аніяк не стане
Воран ды шпаком.
Аніяк не будзе
Песняй кожны верш.
Не сваё вы, людзі,
Не чапайце лепш.

***Канарская Таццяна, 14 гадоў***
ДУА “Юрацішкаўскі яслі-сад – сярэдняя школа”
Іўеўскага раёна (кіраўнік: Свякла А. К., настаўнік
беларускай мовы і літаратуры

**КАМПЛІМЕНТЫ РУЖЫ**

У летні час у кветніку парадак:
Лягла мяжа між новых градак,
Маленькі збоку частакол,
Абвіты Ружай велькі кол.
На першы погляд, лад ды згода,
Цвіце, квітнее ўся прырода.
Але прыслухайся пад вечар,
Калі крыху прыціхне вецер,
Якая гутарка вядзецца,
Як выхваляюць кветкі ружу,
(Яна ж глядзіць ў люстэрка-лужу),
Якія дораць кампліменты,
Нібыта зоркі-дыяменты.
Так сцелюцца ды так лагодзяць,
Якія словы вынаходзяць!
Ты прыгажуня, чараўніца,
Жыцця у кветніку крыніца,
Як мы цябе ўсе паважаем,
У госці шчыра запрашаем.
Такая доўжыцца размова
Амаль штодня, ды слова ў слова.
Як толькі Ружа адвярнецца,
Зусім другое з вуснаў льецца:
- Да прыгажуні ёй далёка!
- Ага, крывая,гляньце збоку!
А гонару – не утрымацца!
Уборы – хочацца смяяцца!
Агідных слоў гучыць нямала.
Дарэмна сэрца адкрывала…

Тым, хто да зайздрасці ахвочы,
Краса чужая коле вочы.

**Верабей Ганна, 15 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа №35 імя М.А. Волкава г. Гродна"
(кіраўнік – Каралевіч Л. І., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## СЯБРЫ

Не казка гэта і не жарт,
Бо ў лесе здарыўся пажар.
Мядзведзя домік крайнім быў –
Агонь дашчэнту ўсё спаліў.
І хоць не мог знайсці ён слоў,
Але ж звярнуўся да сяброў:
- Дапамажыце мне, звяры,
Пабудаваць бярлогу вы!
Не маю месца і прытулку,
Таму прашу вас аб ратунку.
Ліса скрывіла ў адказ рожу:
Спіна баліць, аж жыць не можна –
Няхай хто іншы дапаможа.
Воўк адказаў: "Не маю часу!"
Касы прыбег – не даў адказу.
Ды толькі сціплы, малы вожык
Прамовіў ціха: "Дапаможам.
Паклічу жонку і дзяцей –
З бядою справімся хутчэй".

Так бывае й між людзей:
Сяброў пазнаеш у бядзе.

**Казінская Юлія, 13 гадоў**
ДУА “Сярэдняя школа №15 г. Ліды” (кіраўнік Вянсковіч Н. І., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

**ЖУК-РАГАЧ**

На палянцы за кусточкам
Сход сабралі вечарочкам
Жаба, Дзяцел, Воўк, Павук,
Лось, Мядзведзь, прыплёўся й Жук.
Сталі думаць-вырашаць,
Як ім зіму зімаваць.
– Дом нам трэба, – кажа Жабка. –
Будзе цёпла, добра, мякка.

Свае рожкі Жук наставіў,
Крыльцы чорныя расправіў.
– Жу-жу-жу! – крычыць рагач. –
Жа-жа-жабка, ты прабач.
Дом які ж нам будаваць,
Каб мядзведзь у ім мог спаць?!
Я маленькі, мне не трэба
Месца шмат, як таго неба.
Спіну гнуць не буду я
На Мядзведзя і Лася,
Пад грыбочкам дом збудую
Ды адзін перазімую.

І, накрыўшыся лісточкам,
Пад зялёненькім кусточкам
Адпачыць лёг наш Жучок,
Мох паклаўшы пад бачок.

А ў лесе (вось вам раз!)
Ветрык бег у гэты час.
Ліст з жуком перакруціў
І на спіну апусціў.
Жук крычыць:
– Жу-жу! Пусціце!
Устану сам я! Адыдзіце!
Ды ўстаць сам Жук не змог,
Пакуль Лось не дапамог.

Жабка тут і не стрывала,
Слова мудрае сказала:
– Ганарлівы ты і ўпарты,
А нічога, брат, не варты!

---

Дзе Жук цяпер? Сярод якіх жыве лясоў?
Напэўна, зноў палохае звяроў.
А можа, хто па рожках даў,
Каб Жук нарэшце замаўчаў.



Малюнак

Мацукевіч Насці, 7 гадоў

**Шыдук Карына**, **13 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа №5 г. Смаргоні" (кіраўнік: Цітова М. С., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## МАГУТНЫ ЛЕЎ І РАЗУМНЫ ЗАЯЦ

У лесе жыў магутны Леў,
Вялікі надта гонар меў.
Рашыў слабейшых пакараць,
Сваю ўладу ўмацаваць.

Хадзіў, задраўшы галаву,
Зняважыў рыжую Лісу,
З Ваўка смяяўся і казаў,
Каб Заяц з лесу ўцякаў.

- Вы слугаваць павінны мне,
Бо без улады без мае
Вы ўсе пустое, вы – нулі!
Нікчэмнасць, тлен і жабракі.

Абразу львіную не змог
Сцярпець ні Воўк, ні Насарог,
А Заяц вельмі абурыўся,
Змагацца з ворагам рашыўся.

Звярнуўся Заяц да ваўкоў,
Лісіц і ўсіх лясных звяроў,
Да птушак, мошак, мураўёў,
Да касавокіх дружбакоў.

- Братва, збірайцеся хутчэй!
Дубіны ў рукі і шпарчэй
Абараняць спакой лясоў
І дружбу моцную звяроў!

І паваліў лясны народ,
Звязалі Льва ды кляп – у рот.
Як ён ні біўся, ні шалеў -
Уладу страціў грозны Леў!!!

Які б ні быў магутны Ты,
Калі нас многа, сіла – Мы!



Малюнак
Шаўцовай Паліны, 8 гадоў

**Жамойць Вераніка, 15 гадоў**
ДУА "Шчорсаўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа" Навагрудскага раёна (кіраўнік: Саўко Г. М., настаўнік).

## ХАБАР – НЕ ШЧАСЦЕ

Палкан вартаўнікам служыў на складзе,
Някепска жыў на неблагім акладзе,
Адна бяда, што сквапныя меў вочы,
Да хабару ён вельмі быў ахвочы.
Калі так цягнеш – ой, як ён заенчыць!
А дасі ў лапу – шчэ й паддасць на плечы.
Аднойчы Шэры сцяг са склада боты, -
Бач жонцы пафарсіць ахвота.
Палкан заўважыў ды і кажа:
- Вова!
Цябе я ведаў вось такім! Зусім малога.
Няўжо за ласку не аддзячыш,
Куском добрым не заплаціш?
Шэры быў і будзе Воўкам,
Сабаку кінуў старублёўку.
Палкан шчаслівы, у захапленні.
-----
Хабар ёсць,
А дзе сумленне?
На жаль, чаго хаваць заганы,
Ёсць і ў нас яшчэ Палканы.

**Дадахонава Дзіяна,15 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа № 6 г. Гродна" (кіраўнік: Аляхновіч М. В., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## КАЗЁЛ І ПЛОТ

Казёл хацеў залезці ў агарод,
Але перашкаджаў яму высокі плот.
Казёл яго рагамі так і гэтак б'е,
Злуецца і высокі плот кляне,
Што ў агарод закрыты ход.
Але каб мог казёл пашавяліць мазгамі,
То зразумеў бы ён,
Што гэты вось высокі плот
Ратуе ўраджай і агарод,
Што корміць ён Казла зімою
І цэлы год усенькі яго род.
І вывад тут напрошваецца сам
Не месца ў агародзе ні козам, ні казлам!

**Буйвал Уладзіслаў, 15 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа №4 г. Навагрудка" (кіраўнік: Бузук Л. А., педагог-арганізатар).

## ЖУК І ЖАБА

Як вялікі дзед Кандрат,
Стаў і я ў хіт - парад:
Байку вырашыў складаць,
Каб моладзь нашу паўшчуваць.

Сышліся неяк Жук і Жаба
І дзеляцца такім раскладам.
Тут Жаба квакнула Жуку:
- Вучыцца ва "ўнівер" пайду.
Жук падумаў і жужыць:
- І мне там пэўна варта быць.
Сябры мае, крыху пастойце,
Намеры вашы супакойце,
уключылася ў сказ Сава.-
- Ва ўніверсітэты паступаць-
Прадметы трэба знаць на "яць".
Вы ж час вучэбны прамарнелі,
Толькі квакалі й жужэлі.
Ды і тэсты трэба вам здаваць.
-А што іх здаць?!
Тут – два, тут – пяць –
І норму лёгка можна ўзяць.
І ўзялі і два, і пяць,
А мары гэтым не дагнаць.

- Не так тут проста,-
мушу вам сказаць. -
На тэсты трэба шчыра працаваць,
Сумленнай працай веды дабываць.

***

Вось пайшлі менталітэты,
Усе жадаюць ва ўніверсітэты.
А ўстановам трэба знак трымаць,
Каб Жук і Жаба перасталі квакаць і жужаць.

**Зубель Павел, 16 гадоў**
ДУА "Сярэдняя школа № 3 г. Свіслачы" (кіраўнік: Русак Н. Р., настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

## У МАСТАЦКІМ АГАРОДЗЕ

А ў мастацкім агародзе,
Чутка ходзіць у народзе,
Крапіва ў свой юбілей
Запрашае тут гасцей.
Першымі з'явілісь дзеці
Паглядзець, ну, што ў свеце?
Што змянілась у людзей,
Шмат якіх прайшло падзей?
Ехаў Дзед на юбілей,
З ім на возе – Баба.
А з-за Асла вушэй
Выглядвала  Жаба.
Гонар свой усім паказаць
Парсюк у людзі прэцца.
І баран сваё імя
Ілбом прабіць нясецца.
Шмат каго йшчэ тут прыйшло,
Байкамі апетых,
За сталом – як наплыло
Для такой бяседы.
Слова між другіх тастоў
Узяў махальнік Іваноў,
Доўга, чуйна гаварыў,
Нібы з збана воду ліў.
За гэта папугай прамоўцу
Нават  пахваліў:
-   Ты, - кажа, - Іваноў,
Сапраўдны падхалім.
Сам Крапіва, зірнуўшы на гасцей,:
"Эх даць бы вам па хвасце,
Як тому цюціку Жуку," –
Падумаў і ўзняў руку:

- Дазвольце слова мне сказаць,
Час мінае - Вас і не пазнаць,
Але заганы ў Вас жывыя,
Вы ўсе да аднаго такія ж.
Жыццё псуеце, як раней,
Ад бараноў і да свіней.
Скажам Вам, нарэшце,
Ехаць па жыцці было б
Без вас лягчэй…
… Паспрабуйце злезці!

# ЗМЕСТ

## ВЕРШЫ

Ад складальніка ……………… 3

***Самушчык Ганна, 10 гадоў***
"Глядзеў на свет з усмешкаю паволі…" ………………………………… 5

***Тарас Марыя, 10 гадоў***
Наш дзед Кандрат ……………………… 5

***Федасюк Ганна, 10 гадоў***
"У прыгожай вёсачцы Нізок…" ... 6

***Ануфрыева Настасся, 10 гадоў***
"Крапіва – пісьменнік шчыры…".6

***Багдановіч Артур, 11 гадоў***
Кандрат Крапива ……………………7

***Вітукевіч Ігнат, 11 гадоў***
Крапива И Крапива ………………… 7

***Яшкіна Аліна, 11 гадоў***
Верш пра Валю ………………………8

***Даўгун Надзея, 12 гадоў***
Кандрату Крапіве ……………………9

***Чугай Ксенія 12 гадоў***
У мастацкім агародзе… ……………11

***Белагур Яўгенія,14 гадоў***
"Бацька з маці вельмі рады…"....11

***Калодка Дзяніс, 13 гадоў***
"У мастацкім агародзе…"…………12

***Лаўрушчык Ксенія, 14 гадоў***
Зорка Кандрата Крапівы ………. 14

***Кузьміч Ганна,14 гадоў***
Кандрату Крапіве ……………………. 14

***Муртазіна Вікторыя, 14 гадоў***
Кандрат Крапіва …………………… 16

***Мулярчык Кацярына, 15 гадоў***
У мастацкім агародзе… ………… 17

**Бутрым Андрэй, 15 гадоў**
Урок жыцця……………………………18

***Кепель Мікіта, 16 гадоў***
Слова мужнасці і праўды ……… 19

***Галонская Надзея , 14 гадоў***
Кандрату Крапіве …………………… 21

***Чакавая Алена, 13 гадоў***
Старэнькі верабей ………………… 21

***Тучкоўскі Яўген, 15 гадоў***
"Сяджу, вучу Кандрата Крапіву…" ………………………………………… 22

***Маркель Мікіта, 15 гадоў***
Паэту …………………………………… 22

***Клімец Яўгеній, 15 гадоў***
З думкай аб Кандраце Крапіве ………………………………………… 23

***Казакевіч Дзіяна, 15 гадоў***
Прысвячэнне Крапіве ……………. 24

*Будрэвіч Марта, 16 гадоў*
Пякучае слова жывое ……………26

*Дрэма Лізавета, 17 гадоў*
Вострасловы дзед Кандрат …… 26

*Халупка Аліна, 16 гадоў*
Мараль Кандрата Крапівы …… 27

*Галафаста Ільы, 17 гадоў*
Кандрату Крапіве... ………………28

## БАЙКІ

*Пракопчык Тімафей, 7 гадоў*
Задавака рыжий кот …………….. 30

*Казакевіч Арына, 9 гадоў*
Хто лепшы? ……………………….. 30

*Плотнікаў Кірыл, 9 гадоў*
Сабака і мясная крама …………31

*Гаўрылюк Варвара, 9 гадоў*
Слабы і дужы ……………………. 32

*Лях Лізавета, 10 годоў*
Задзіра ……………………………... 34

*Чурылава Ульяна, 13 гадоў*
Спрэчка …………………………… 35

*Капачэўская Ганна, 12 гадоў*
Як кот з мышамі сыр дзяліў ….. 36

*Каржонка Дар'я, 14 гадоў*
Воран і шпак ……………………... 38

*Канарская Таццяна, 14 гадоў*
Кампліменты ружы ……………. 39

*Верабей Ганна, 15 гадоў*
Сябры ……………………………….. 40

*Казінская Юлія, 13 гадоў*
Жук-рагач …………………………. 41

*Шыдук Карына, 13 гадоў*
Магутны леў і разумны заяц …. 43

*Жамойць Вераніка, 15 гадоў*
Хабар – не шчасце ……………….. 45

*Дадахонава Дзіяна,15 гадоў*
Казёл і плот ……………………….. 45

*Буйвал Уладзіслаў, 15 гадоў*
Жук і жаба ………………………… 46

*Зубель Павел, 16 гадоў*
У мастацкім агародзе…………….. 47

Літаратурна-мастацкае выданне

**У мастацкім агародзе..**

На першай старонцы вокладкі малюнак
Мілько Сафіі, 7 гадоў
Кіраўнік: Раманава Любоў Раманаўна

Кампьютарны набор, верстка, дызайн: Г.П. Кузнецкая